УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
______________ А.І.Жук
«17» 04 __________ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД 31-1-77/2024 /вуч.

**СУСВЕТНАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя
(Беларуская мова і літаратура);
6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя
(Беларуская мова і літаратура, Замежная мова
(з указаннем мовы))**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0113-02-2023 (02.08.2023, №225), вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура (23.02.2023, №048 – 2023/у); Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) (23.02.2023, №050 – 2023/у); Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская) (23.02.2023, №049 – 2023/у))

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
Л.П.Леська, дацэнт кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук;
С.А.Сычова, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Л.М.Надумовіч, дацэнт кафедры славянскіх моў установы адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
А.І.Жынкевіч, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар
ДУА «Гімназія № 43 г. Мінска» М.Ф.Кавалеўская

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 8 от 25.03.2024 г.)

Загадчык кафедры І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 6 ад 16.04.2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела БДПУ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Сусветная дзіцячая літаратура» прызначана для студэнтаў установы вышэйшай адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», якія навучаюцца па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура; Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)), з’яўляецца дысцыплінай модуля «Асновы літаратурнай адукацыі» і ўваходзіць у сістэму літаратуразнаўчай падрыхтоўкі студэнтаў 1 курса філалагічнага факультэта.

***Мэты*** вучэбнай дысцыпліны: авалоданне студэнтамі ведамі пра шляхі развіцця сусветнай дзіцячай літаратуры ад вытокаў да сучаснасці, адметнасці творчасці пісьменнікаў для дзяцей, месца іх твораў у літаратурным працэсе, а таксама авалоданне навыкамі выкарыстання твораў у адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

***Задачы*** вучэбнай дысцыпліны:

– даць студэнтам цэласнае ўяўленне пра сусветную дзіцячую літаратуру як самастойную гісторыка-літаратурную з’яву, што адлюстроўвае агульныя тэндэнцыі развіцця культуры, літаратуры і педагагічнай думкі;

– пазнаёміць з асноўнымі этапамі, важнейшымі заканамернасцямі ў развіцці сусветнай дзіцячай літаратуры;

– вывучыць творчасць аўтараў, чые творы ўваходзяць у кола дзіцячага чытання, прааналізаваць асаблівасці іх творчасці, змест твораў, паказаць ролю пісьменнікаў у літаратурным працэсе;

– паказаць жанравую разнастайнасць літаратуры для дзяцей;

– выпрацаваць навыкі аналізу мастацкага твора, уменне ацэньваць ідэйна-эстэтычныя вартасці мастацкіх з’яў, вызначаць пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял твора;

– пазнаёміць з прынцыпамі адбору кніг для дзяцей розных узростаў;

– садзейнічаць выхаванню эстэтычнага густу, развіццю самастойнага творчага мыслення;

– фарміраваць і развіваць сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі студэнтаў, заснаваныя на ведах па прадмеце, эмацыянальна-каштоўнасным і творчым вопыце, што будзе спрыяць вырашэнню і выкананню грамадзянскіх, прафесіянальных задач і функцый.

Вучэбная праграма вучэбнай дысцыпліны «Сусветная дзіцячая літаратура» прадугледжвае дэталёвы разгляд твораў для дзяцей і шырокае выкарыстанне магчымасцей літаратуры ў працэсе прафесіянальнай падрыхтоўкі студэнтаў.

Практычныя заняткі павінны насіць актыўны, творчы характар, развіваць самастойнасць мыслення студэнтаў. Заняткі можна праводзіць у форме гутаркі, абмеркавання падрыхтаваных студэнтамі паведамленняў, рэцэнзій, напісаных імі на зборнікі твораў для дзяцей.

Некаторыя тэмы рэкамендуюцца для самастойнага вывучэння, прычым выкладчык арыентуе студэнтаў на навуковы пошук адпаведнай літаратуры, дакладна акрэслівае мэты і задачы даследчай працы.

***Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста, сувязі з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі.*** Вучэбная дысцыпліна «Сусветная дзіцячая літаратура» прызначана для студэнтаў УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», якія навучаюцца па спецыяльнасці 6-05-0113-02

Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура), (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы).

Вучэбная дысцыпліна «Сусветная дзіцячая літаратура» грунтуецца на прынцыпах каардынацыі па лініі міжпрадметных сувязей з вучэбнымі дысцыплінамі «Вусная народная творчасць», «Уводзіны ў літаратуразнаўства», якія ўваходзяць у кампанент установы вышэйшай адукацыі для спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура), (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы).

***Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сусветная дзіцячая літаратура» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура) спецыялізаванай кампетэнцыі СК-3: Характарызаваць асноўныя тэндэнцыі развіцця дзіцячай літаратуры, абапіраючыся на знакавыя літаратурныя творы для дзяцей; у студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)) – спецыялізаванай кампетэнцыі СК-2: Характарызаваць асноўныя тэндэнцыі развіцця дзіцячай літаратуры, абапіраючыся на знакавыя літаратурныя творы для дзяцей.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***ведаць*:**

- шляхі і галоўныя этапы развіцця сусветнай літаратуры для дзяцей ад вытокаў і да нашых дзён;
- асноўныя этапы жыццёвага і творчага шляху дзіцячых пісьменнікаў;
- узаемасувязь светапогляду і творчасці пісьменніка, асаблівасці яго стылю ці творчай манеры;
- канкрэтна-гістарычнае, нацыянальнае і агульначалавечае значэнне мастацкіх твораў;
- галоўныя ідэйна-эстэтычныя праблемы вывучаемых твораў, асаблівасці іх кампазіцыі і вобразна-выяўленчых сродкаў;
- герояў твораў, адметныя рысы характару, месца ў сістэме вобразаў;
- заканамернасці існавання і развіцця літаратурных жанраў;
- літаратуразнаўчыя крыніцы па тэмах дысцыпліны.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***умець*:**

- аналізаваць літаратурны твор, раскрываючы асаблівасці яго зместу і формы;
- выяўляць падобнае і адрознае ў літаратурах для дзяцей розных часоў і народаў;
- вызначаць месца твора ў мастацкай сістэме пісьменніка і ў літаратуры свайго часу;
- ацэньваць ідэйна-эстэтычныя вартасці мастацкіх з'яў;
- складаць тэсты, віктарыны, красворды па літаратурных творах, фактах жыццёвага і творчага шляху аўтара;
- працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай па дысцыпліне для паглыблення ўласных ведаў, больш шырокага разумення эстэтычнай і грамадскай каштоўнасці твораў ці ў цэлым творчасці пісьменніка, а таксама для развіцця ўмення самастойнай навукова-даследчай працы.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен ***валодаць*:**

- метадалогіяй літаратуразнаўчага аналізу;

- навыкамі свабоднага карыстання адпаведным літаратуразнаўчым апаратам пры рашэнні канкрэтных задач;
- навыкамі выразнага чытання твораў.

Прапанаваная канцэпцыя вучэбнай дысцыпліны прадугледжвае фарміраванне ў студэнтаў усёй сукупнасці ведаў, уменняў і навыкаў па дзіцячай літаратуры ў адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі, а таксама ў пэўнай ступені фарміраванне светапогляду студэнтаў, развіццё творчага мыслення і эстэтычнага густу.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Сусветная дзіцячая літаратура» студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Асноўнымі тэхналогіямі навучання з’яўляюцца: праблемнае навучанне (праблемнае выкладанне, пошукавы метад); камунікатыўныя тэхналогіі, заснаваныя на актыўных формах і метадах навучання (дыскусія, круглы стол, прэзентацыя, работа ў групах); асобасна арыентаваная тэхналогія.

***Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.*** Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Сусветная дзіцячая літаратура» выкарыстоўваюцца такія формы самастойнай работы, як выкананне індывідуальных заданняў на практычных занятках, выкананне індывідуальных заданняў пазааўдыторна (самастойная работа студэнтаў), напісанне рэфератаў, падрыхтоўка дакладаў, афармленне часопісаў, складанне анталогій і інш.

***Агульная колькасць гадзін, колькасць аўдыторных гадзін, форма атрымання вышэйшай адукацыі, размеркаванне аўдыторных гадзін, формы прамежкавай атэстацыі.*** Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Сусветная дзіцячая літаратура» на 2 курсе ў 3-м семестры разлічана на 108 гадзін, з іх 48 аўдыторных: 24 лекцыйных і 24 гадзіны практычных заняткаў, 60 гадзін адведзена на самастойную работу. Форма адукацыі – дзённая. Форма прамежкавай атэстацыі – залік (III семестр).

Размеркаванне гадзін па семестрах:

| **Семестр** | **Усяго** | **Лекцыі** | **Практычныя** | **Самастойная работа студэнтаў** | **Форма прамежкавай атэстацыі** |
|---|---|---|---|---|---|
| III | 108 | 24 | 24 | 60 | Залік |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## ТЭМА 1. СПЕЦЫФІКА ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК МАСТАЦТВА СЛОВА. ВЫТОКІ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

### 1.1. Адметнасць дзіцячай літаратуры як мастацтва слова. Дзіцячая літаратура як вучэбны прадмет.

Дзіцячая літаратура як мастацтва слова і як вучэбны прадмет. Спецыфіка літаратуры для дзяцей, сувязь з народнай творчасцю, педагогікай, псіхалогіяй. Асаблівасці літаратуры, прызначанай для дзяцей дашкольнага ўзросту і малодшага школьнага ўзросту. Роля мастацкага афармлення кніг для дзяцей.

Пытанні развіцця літаратуры для дзяцей у працах Якуба Коласа, Янкі Маўра, Алеся Якімовіча. Выступленні Васіля Віткі па праблемах выхавання дзяцей і развіцця дзіцячай літаратуры. Выхаванне любові да слова і адчування яго харства (кнігі «Дзеці і мы», «Урокі», «Азбука душы», «Дом, дзе жывуць словы»). Выбраныя артыкулы С. Маршака ў кнізе «Выхаванне словам». Карней Чукоўскі пра спецыфіку мастацкай літаратуры для юнага чытача («Запаведзі для дзіцячых паэтаў»). Педагагічныя і эстэтычныя погляды А. Барто ў кнізе «Записки детского поэта». Д. Радары аб прыродзе фантазіі і развіцці словатворчасці дзяцей («Грамматика фантазии»).

Навуковыя пошукі ў дзіцячай літаратуры, фундаментальныя працы па гісторыі і тэорыі дзіцячай літаратуры. Праблемы дзіцячай літаратуры на старонках перыядычнага друку. Агляд вучэбнай і крытычнай літаратуры па дысцыпліне.

Вусная народная творчасць як першааснова дзіцячай літаратуры.

Міфы народаў свету. Міф як першасная форма мастацкай свядомасці чалавецтва. Міф і літаратурны сюжэт. Эстэтычная і пазнавальная каштоўнасць міфаў.

Малыя фальклорныя жанры. Агульнае паняцце пра дзіцячы фальклор. Класіфікацыя. Паэтычная своеадметнасць твораў гульнёвага (забаўлянкі, лічылкі, скорагаворкі) і пазагульнёвага (калыханкі, заклічкі, прыгаворкі, загадкі, песні) фальклору, абрадавай паэзіі. Творы, звязаныя з сюжэтна-арганізаванымі маторнымі дзеяннямі (пацешкі, пястушкі, забаўлянкі), слоўныя гульні. Уласна дзіцячыя гульні: функцыянальнае прызначэнне, формы выканання («Каршун», «Ваўкі і авечкі», «Проса», «Заінька» і інш.). Прапаганда малых фальклорных жанраў у педагагічнай спадчыне К. Ушынскага, Л. Талстога, Васіля Віткі. Малыя фальклорныя жанры ў нацыянальнай праграме «Пралеска», у праграме пачатковай школы. Асноўныя патрабаванні да працэсу чытання і аналіза твораў розных жанраў вуснай народнай творчасці.

Фальклорны эпас. Народная казка: генезіс, спецыфіка жанру, прынцыпы класіфікацыі. Казкі ў апрацоўцы Якуба Коласа, А. Якімовіча, У. Дубоўкі, Максіма Танка, У. Ягоўдзіка, А. Афанасьева, К. Ушынскага, Л. Талстога, Ш. Перо, Я. Грым і В. Грым. Традыцыі эпічных жанраў у класічнай і сучаснай прозе для дзяцей.

Узнікненне дзіцячай літаратуры. Станаўленне і развіццё літаратуры для дзяцей на тэрыторыі славянскіх дзяржаў. Першыя рукапісныя і друкаваныя кнігі (азбукі, буквары, азбукоўнікі) і гістарычныя прычыны іх з’яўлення. Лацінская граматыка Дзімітрыя Герасімава (1491). «Азбука» Івана Фёдарава (1574). Буквар Васіля Бурцава (1634). «Лицевой букварь» Карыёна Істоміна (1694). Іх склад, змест і ідэйная накіраванасць.

Кнігі для дзяцей пачатку XVII ст. Пашырэнне тэматыкі, узмацненне вобразнасці. Першыя апавяданні і аповесці для дзяцей. Развіццё жанру байкі. Байкі

Эзопа ў перакладзе для дзяцей.

Уплыў рэформ Пятра I на развіццё культуры, адукацыі, дзіцячай літаратуры XVIII ст. Друкаваныя выданні: «Буквар» (1701) Фёдара Палікарпава, «Пісьмоўнік» (1769) Мікалая Курганава, «Дзіцячая філасофія...» (1760) Андрэя Болатава. Асаблівасці зместу, прынцыпы пабудовы. Асветніцкая дзейнасць Мікалая Новікава. Развіццё гістарычнай, навукова-пазнавальнай літаратуры для дзяцей, распаўсюджванне перакладных навукова-пазнавальных кніг («Мир в картинках» Я.А. Каменскага, выд. на рускай мове ў 1768 г. пад назвай «Видимый мир»).

Распаўсюджванне на Беларусі рускіх кніг вучэбнага прызначэння: буквароў, азбукоўнікаў. Узнікненне беларускага кнігадрукавання (Францыск Скарына «Псалтыр» (1517) – «Детям малым початок всякое доброе науки…», Сымон Будны «Катэхізіс» (1562) – кніга для дарослых і падручнік для дзетак; Лаўрэнцій Зізаній «Наука ку читаню и розуменю письма словенского» (1596)). Фарміраванне асноўных жанраў літаратуры для дзяцей.

Літаратура еўрапейскага Адраджэння і эпохі Асветніцтва ў дзіцячым чытанні. Заканамернасць уваходжання рамана Д. Дэфо «Рабінзон Круза» ў дзіцячае чытанне, своеадметнасць дыдактычных установак у пераказе Карнея Чукоўскага. «Падарожжа Лемюэля Гулівера» Дж. Свіфта ў пераказе Т. Габбе: гратэск, фантастыка, сатыра і гумар як сродкі выхавання маленькага чытача. Традыцыі фантастычнага рамана ў сусветнай дзіцячай літаратуры. Літаратура рамантызму ў дзіцячым чытанні (Ш. Перо, Э. Т. А. Гофман і інш.)

## ТЭМА 2. ЖАНР КАЗКІ Ў ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

### 2.1. Эвалюцыя жанру казкі ў рускай і беларускай літаратуры

Жанр літаратурнай паэтычнай казкі. Фальклорныя і літаратурныя вытокі казак В. Жукоўскага «Сказка о царе Берендее» (1831), «Спящая царевна» (1831), «Сказка об Иване-царевиче и Сером волке» (1845), «Кот в сапогах» (1845), «Мальчик-с-пальчик» (1851), іх сувязь з рамантычнай традыцыяй. Наватарства, мастацкая каштоўнасць казак А. Пушкіна, якія ўвайшлі ў дзіцячае чытанне: «Сказка о царе Салтане» (1830), «Сказка о попе и о работнике его Балде» (1830), «Сказка о мёртвой царевне и о семи богатырях» (1833), «Сказка о рыбаке и рыбке» (1833), «Сказка о золотом петушке» (1835). Гісторыя стварэння казак, фальклорнае і аўтарскае ў іх. Шматзначнасць зместу, псіхалагізм у раскрыцці вобразаў, эмацыянальная насычанасць.

Традыцыі А. Пушкіна ў паэтычнай казцы П. Яршова «Конёк-горбунок» (1834). Феномен «Конька-горбунка». Спалучэнне фантастычнага з рэаліямі народнага жыцця, гумар, займальнасць і дынамічнасць сюжэта, меладычнасць і народнасць мовы.

Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці паэтычнай казкі для дзяцей XX ст. Карней Чукоўскі – паэт-наватар, першаадкрывальнік, эксперыментатар, стваральнік непаўторнага казачнага свету. Вытокі «тэатральнай» прыроды казак Карнея Чукоўскага «Мойдодыр», «Тараканище», «Муха-Цокотуха» (усе напісаны ў 1923 г.), «Чудо-дерево» (1924), «Бармалей» (1925), «Телефон», «Федорино горе», «Путаница» (усе напісаны ў 1926 г.), «Айболит» (1929), ідэйны і пазнавальны бок казак, майстэрства пабудовы сюжэта, музычнасць. Гульня як структураўтваральны фактар, які аб’ядноўвае ў казачным свеце Карнея Чукоўскага дзіцячы, фальклорны і ўласна аўтарскі пачаткі. Жанравая адметнасць казкі С. Міхалкова «Щенок». Развіццё рускай паэтычнай казкі на сучасным этапе.

Жанр літаратурнай празаічнай казкі. «Чёрная курица, или Подземные жители» (1828) Антонія Пагарэльскага – яркі твор рускага рамантызму ў дзіцячай літаратуры.

Праблематыка, вобразная сістэма, жанравая спецыфіка. Суадносіны фантастычнага і рэальнага. Творчасць У. Адоеўскага ў кантэксце рускай рамантычнай прозы 30-х гадоў XIX ст. Навукова-фантастычная казка «Городок в табакерке» (1834) – адзін з найбольш значных твораў рускай навукова-пазнавальнай літаратуры. Яркасць вобразаў і высокае майстэрства папулярызацыі навукова-тэхнічных ведаў. Казка С. Аксакава «Аленький цветочек» (1858), крыніцы і паэтыка казкі.

Выкарыстанне фальклорнай паэтыкі ў казках К. Ушынскага, Л. Талстога. Народна-паэтычная традыцыя ў казках Д. Маміна-Сібірака «Серая Шейка» (1893), «Алёнушкины сказки» (1894–1897). Значэнне твораў для маральнага і эстэтычнага выхавання дзяцей. Традыцыі Х. К. Андэрсана ў творчасці У. Гаршына. Казкі для дзяцей: «Сказка о жабе и розе» (1884), «Лягушка-путешественница» (1887). Алегарычнасць вобразаў, супрацьпастаўленне прыгожага і агіднага, добрага і злога. Маральна-эстэтычны патэнцыял казак П. Бажова. Жанравая навізна трылогіі «Приключения Незнайки и его друзей» (1954), «Незнайка в Солнечном городе» (1958), «Незнайка на Луне» (1965) М. Носава. Раскрыццё этычных катэгорый у казках В. Катаева «Цветик-семицветик» (1940), «Дудочка и кувшинчик» (1940), у аповесці-казцы С. Міхалкова «Праздник непослушания» (1976). Пародыя і слоўная гульня як вядучыя рысы вясёлых аповесцей-казак Э. Успенскага «Крокодил Гена и его друзья» (1966), «Вниз по волшебной реке» (1972), «Дядя Фёдор, пёс и кот» (1973), «Гарантийные человечки» (1975), «Школа клоунов» (1983), «Колобок идёт по следу» (1987). Празаічная казка ў сучаснай рускай літаратуры.

Шляхі развіцця беларускай літаратурнай казкі. Народная казка ў апрацоўцы Цёткі, Якуба Коласа. Творчае пераасэнсаванне матываў твораў «Дуб і чароціна», «Цяжкая доля», «Лёгкі хлеб» у вершаванай казцы Якуба Коласа «Рак-вусач» (1926), вобразы рака-пустэльніка, карася-паэта, жыта, паэтызацыя прыроды; эстэтычнае, пазнавальнае і выхаваўчае значэнне казкі. Майстэрства М. Багдановіча як паэта-казачніка, зварот да фальклорных матываў, далучэнне дзяцей да асноў народнай маралі ў казцы «Мушка-зелянушка і камарык – насаты тварык» (1915).

Дыскусія аб развіцці казачнага жанру ў літаратуры для падрастаючага пакалення. Жанр казкі ў дзіцячай літаратуры 30-х гг. Трансфармацыя фальклорных матываў у казках А. Якімовіча «Каваль Вярнідуб», «Пра смелага Вожыка»; А. Якімовіч – перакладчык казак А. Пушкіна, Карнея Чукоўскага. Фальклорныя матывы ў казках «Скарб», «Музыка» Змітрака Бядулі.

Маральна-эстэтычны вопыт фальклору народаў свету ў вершаваных казках У. Дубоўкі. Зварот да праметэеўскіх матываў у казцы «Як Сінячок да сонца лётаў», паэтызацыя красы і велічы чалавека працы – «Чые рукі прыгажэйшыя», асуджэнне людскіх заган: сквапнасці, эгаізму, здрады сяброўству, гультайства – «Сквапныя мядзведзікі», «Пузыр, Саломіна і Лапаць», «Айога», «Праўдзівы хлопчык» і інш. Афарыстычныя выслоўі ў казках У. Дубоўкі, іх павучальны сэнс. Блізкасць твораў У. Дубоўкі да «Казак жыцця» Якуба Коласа і апрацаваных легенд Максіма Танка.

Традыцыйныя фальклорныя вобразы і матывы, наватарства У. Караткевіча-казачніка. Тэматыка і праблематыка вершаваных казак Максіма Танка для дзяцей, змешчаных у кнігах «Ехаў казачнік Бай» (1955, 2-е, дапоўненае выданне – 1983), «Блікі сонца» (1997). Услаўленне смеласці і самаахвярнасці ў барацьбе за праўду і справядлівасць («Сказ пра Вяля»). Ідэя неператможнасці мастацтва («Казка пра Музыку»). Народная легенда пра музыку ў апрацоўцы Я. Коласа, З. Бядулі, У. Дубоўкі і Максіма Танка. Паэтычная апрацоўка народных казак «Конь і Леў», «Галінка і верабей», «Ехаў казачнік Бай», «Журавель і чапля», маральна-этычныя

праблемы ў творах. Вершаваныя казкі з уласна аўтарскім сюжэтам «Жук і слімак», «Мухамор», «Казка пра мядзведзя», «Сярод лясоў наднёманскіх», праблемы таварыскасці, сціпласці ў іх. Спалучэнне рэальнага і неверагоднага, напаўненне традыцыйнага казачнага сюжэта сучасным зместам – «Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні» (1979) Максіма Танка.

Высокая паэтычная культура, спалучэнне заснаваных на народна-паэтычнай глебе займальнасці і пазнавальнасці як адметныя рысы творчасці Васіля Віткі. Гісторыя стварэння, пафас дзейснай дабрыні, узаемадапамогі ў казках «Вавёрчына гора» (1947), «Буслінае лета» (1957), «Казка пра цара Зубра» (1959), «Птушыная пачатковая школа» (1962), «Азбука Васі Вясёлкіна» (1963), «Казкі і краскі» (1984) і інш. Творчае выкарыстанне народных матываў, сюжэтаў, вобразаў, моўна-выяўленчых сродкаў. Васіль Вітка – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Ганаровага дыплома імя Х. К. Андэрсана. Традыцыі фальклору і наватарскія пошукі Р. Барадуліна ў жанры паэтычнай казкі («Бабуліна казка», «Мех шэрых, мех белых», «Не паслухаў зайчык маму», «Як воўк калядаваў» і інш.).

Узмацненне казачнага пачатку ў прозе Л. Шырко «Дзед Манюкін не салжэ» (1990), «Дзед Манюкін і ўнукі» (2003), У. Ягоўдзіка «Царэўна ў падземным царстве» (2000). Арыгінальныя сюжэты, казачная плынь, прыгодніцкія элементы ў творах. Элементы гульні ў казцы-забаўлянцы У. Ліпскага «Вясёлая азбука» (1992).

Сучасная літаратурная казка і яе асаблівасці. Казкі А. Масла, Г. Аўласенкі, У. Ліпскага, П. Васючэнкі, Л. Улашчанкі, А. Якімовіча, Т. Сівец, К. Хадасевіч-Лісавой. Агляд кніг серыі «Казкі XXI стагоддзя», серыі «Беларуская аўтарская казка» («Чароўныя пацеркі», 2006, «Вежа міру», 2007, «Крынічка Буль-Буль», 2010), «Казачны куфэрак» (2013).

### 2.2. Шляхі развіцця французскай і скандынаўскай літаратурнай казкі

Французская літаратурная казка. Ш. Перо – пачынальнік французскай літаратурнай казкі. Вытокі казак Ш. Перо «Сказки моей матушки Гусыни» (1697), іх маральная аснова, узаемадзеянне рэалістычнага і фантастычнага, сур'ёзнага і камічнага ў казках, вобразы станоўчых і адмоўных герояў.

Алегарычная аповесць-казка А. Сэнт-Экзюпеpы «Маленький принц» (1943): гуманістычная накіраванасць, глыбокі філасофскі падтэкст, духоўны свет, маральныя каштоўнасці, майстэрства ў даследаванні характару дзіцяці.

Значэнне пародыі і слоўнай гульні ў «Сказках для непослушных детей» Ж. Прэвера, жанравая навізна кнігі. Сучасная французская казка ў выданнях для дзяцей: «Семь плюс семь» (1992), «Сказки улицы Брока» (2000) П. Грыпары, «Сказки кота Мурлыки» (2007) М. Эме і інш.

Скандынаўская літаратурная казка. Сусветнае значэнне і наватарскі характар казак Х. К. Андэрсана: зб. «Сказки, рассказанные детям» (1835–1842), «Новые сказки» (1844–1848), «Сказки» (1850), «Новые сказки и истории» (1858–1872). Тры тыпы казак: апрацоўкі Х. К. Андэрсанам раней пачутых народных казак («Огниво», «Принцесса на горошине», «Дикие лебеди», «Свинопас» і інш.), варыяцыі на тэму прачытаных гісторый з твораў розных народаў і часоў («Новое платье короля», «Эльф розового куста» і інш.), уласна аўтарскія казкі («Дюймовочка», «Русалочка», «Стойкий оловянный солдатик», «Ромашка», «Аисты», «Райский сад», «Оле Лукойе», «Гадкий утёнок», «Цветы маленькой Иды»). Заканамернасці пабудовы сюжэта, тыпалогія герояў, асаблівасці аповеду. Ідэі гуманізму, абароны чалавечай годнасці ў казках. Фантастычныя вобразы, адухаўленне знаёмых дзецям прадметаў і з'яў. Паэтычнасць мовы, лірызм, гумар. Прырода ў казках. Эстэтычныя праблемы ў казцы

«Соловей». Хрысціянскія матывы ў казках «Снежная королева», «Колокол» і інш.

Гісторыка-этнаграфічныя і маральныя аспекты рамана-казкі С. Лагерлёф «Удивительное путешествие Нильса Хольгерсона с дикими гусями по Швеции» (1906 – 1907). Пазнавальная каштоўнасць кнігі.

Жанрава-тэматычная разнастайнасць казак А. Ліндгрэн, сцвярджэнне самакаштоўнасці дзяцінства, аднаўленне рэчаіснасці скрозь прызму ўспрымання дзіцяці. Трансфармацыя казачнага жанру ў аповесцях «Малыш и Карлсон». Казачныя аповесці «Малыш и Карлсон» (1973), «Пеппи Длинныйчулок» (1945), выдумка, шчодрая фантазія ў іх, значнасць педагагічнага падтэксту. Праблема адзіноты дзіцяці ў творах пісьменніцы.

Казачная краіна Мумі-троляў Т. Янсан. Адлюстраванне праблем сучаснасці ў творах. «Шляпа волшебника» (1948) – адметны тып аўтарскай казкі. Т. Янсан – ілюстратар сваіх кніг. Трансфармацыя казачнага жанру ў аповесці М.Ківеля «Великолепный господин Весельчак» (2007), творах У. Старка, М. Грыпе.

### 2.3. Англійская, нямецкая, амерыканская літаратурная казка

*Эвалюцыя казкі ў англійскай літаратуры.* Адметнасць англійскіх народных казак «Три медведя», «Три поросёнка» ў перакладзе рускіх пісьменнікаў. Э. Лір – пачынальнік літаратуры нонсэнса. «Невероятная история о великанах и эльфах» (1839).

Наватарства Л. Кэрала ў казках «Алиса в стране чудес», «Алиса в Зазеркалье»: парадаксальнасць аўтарскага мыслення, выкарыстанне слоўнай гульні. Метафара і гіпербала ў паэтыцы Л. Кэрала.

Маральна-філасофскія праблемы ў казках О. Уайльда «Звёздный мальчик», «Соловей и роза» (1891). Прыгажосць і сэнс жыцця ў разуменні герояў казак.

Змястоўная і мастацкая каштоўнасць анімалістычных казак Д. Р. Кіплінга (зборнік «Вот так сказки»). Д. Р. Кіплінг – пачынальнік жанра «фэнтэзі». Фантастычная казка «Подарки фей». Далейшае развіццё жанру анімалістычнай казкі ў дылогіі Х. Лофцінга «О докторе Дулитле» (1925, 1953).

Фантастычная феерыя Д. Бары «Питер Пэн»: разнастайнасць характараў, раскрыццё ўзаемадзеяння свету дзяцей і свету дарослых.

Псіхалогія дзіцяці, словатворчасць у казках А. Мілна «Винни-Пух», «Домик на Винниpermittedпуховом перекрёстке», М. Бонда «Медвежонок по имени Паддингтон» (2006). Жанрава-тэматычная разнастайнасць сучаснай англійскай казкі (Д. Бісет, К. Льюіс, К. Рыдэл, П. Сцюарт, Д. Эйкен).

*Шляхі развіцця нямецкай літаратурнай казкі.* Актывізацыя цікавасці да жанру казкі ў эпоху нямецкага рамантызму. Спецыфіка апрацоўкі народных нямецкіх сюжэтаў братамі Якабам і Вільгельмам Грым, асаблівасці «грымаўскага» стылю. Тэматычная разнастайнасць і мастацкія вартасці казак братоў Грым «Мальчик-с-пальчик», «Шиповничек», «Король Дрозд», «Кот в сапогах», «Семь воронов», «Умная Гретель» (I том «Детских и семейных сказок» – 1807 г., II том – 1815 г.). В. Жукоўскі – першы перакладчык казак братоў Грым.

Даследаванне свету дзяцінства ў творы Э. Т. А. Гофмана «Щелкунчик и Мышиный король» (1816), адметнасць сюжэтна-кампазіцыйнай будовы.

Засваенне традыцый сусветнага фальклору, перапляценне рэальнага і неверагоднага, усходні каларыт, фантастычныя сюжэты і вобразы ў казках В. Гаўфа «Маленький Мук», «Карлик Нос», «Калиф-аист», «Холодное сердце» (1827).

Пастаноўка праблемы сапраўдных каштоўнасцей у фантасмагорыі Д. Круса «Тим Талер, или Проданный смех», фальклорная аснова твора.

Трансфармацыя фальклорных матываў у творчасці О. Пройслера («Маленькая Баба-Яга», «Маленький домовой»). Сучасная нямецкая казка ў выданнях для дзяцей.

*Амерыканская літаратурная казка.* Н. Гаторн – заснавальнік амерыканскай дзіцячай літаратуры. Міфалагічныя матывы і вобразы ў кнігах казак «Дедушкино кресло» (1841), «Книга чудес». Дабрыня і справядлівасць у «Сказках дядюшки Римуса» Д. Ч. Харыса. Мастацкія асаблівасці вершаваных казак Доктара Сьюза «Кот в шляпе», «Что я видел на улице», «Сказки про слона Хортона» (1973), літаратурных празаічных казак Л. Ф. Баўм «Волшебник из страны Оз», «Чудесная страна Оз» (пераказ А. Волкава – «Волшебник Изумрудного города»), казак К. Ваненгута.

## ТЭМА 3. АПАВЯДАННЕ І АПОВЕСЦЬ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ У АЙЧЫННАЙ І СУСВЕТНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

### 3.1. Жанр апавядання ў літаратуры для дзяцей

*Жанр апавядання ў беларускай літаратуры.* Гуманістычны змест, маральна-этычная праблематыка апавяданняў Цёткі, змешчаных у кнігах «Першае чытанне для дзетак беларусаў» (1906), «Гасцінец для малых дзяцей» (1906). Выкарыстанне Цёткай фальклорнага матыву аб сірочай долі ў апавяданні «Міхаська». «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа. Кампазіцыя кнігі, ідэйна-тэматычнае і жанравае багацце твораў чытанкі, іх змест: паэтызацыя прыроды («Вясна», «Лета», «Зіма», «Восень»), апісанне вясковага побыту («Вясковая дарога», «Палеская вёска»). Вобразы дзяцей у апавяданнях «Школа», «Прылёт птушак» і інш. Філасофскі сэнс алегарычнага апавядання «Дуб і чароціна». Уплыў кніг «Роднае слова», «Дзіцячы свет» К. Ушынскага. Гуманістычны змест апавяданняў Якуба Коласа «Дзеравеншчына» (1912), «Сірата Юрка» (1914), «У старых дубах» (1912). Прырода і дзеці. Паказ імкнення дзяцей да свету, дзе пануе гармонія. Праблематыка апавядання «Страшнае спатканне». Тыпалагічнае падабенства апавяданняў «Ванька» А. Чэхава і «Дзеравеншчына» Якуба Коласа.

Тэматыка, мастацкія асаблівасці апавяданняў З. Бядулі 1912–1915 гг. «Пяць лыжак заціркі», «Малыя дрывасекі», «Велікодныя яйкі», «Дзе канец свету?», вобразы дзяцей у іх.

Псіхалагічныя апавяданні Янкі Маўра 1930-х гадоў: «Шчасце», «Падарожжа вакол дома», матывы дабрыні, даверу, узаемаразумення паміж людзьмі. Глыбокі псіхалагізм апавядання «Максімка». Роля творчасці Янкі Маўра ў пашырэнні тэматычных абсягаў дзіцячай літаратуры.

Эмацыянальнасць, лірызм, высокая культура мовы як характэрныя рысы творчасці Янкі Брыля для дзяцей. Праблемы маральна-эстэтычнага выхавання ў апавяданнях «Жыў-быў вожык», «Чым накармілі Мішутку», «Ліпа і клёнік» (1988). Глыбіня пранікнення ў псіхалогію дзяцей.

Аналітычнасць і псіхалагізм прозы А. Васілевіч (зборнікі апавяданняў «Сябры», «Калінавая рукавічка»). Тэма «чалавек і прырода» ў апавяданнях А. Васілевіч «Браты-артысты», «Геша», «Бабуліны кватаранты» і інш. Раскрыццё ўнутранага свету дзяцей. Эмацыянальнасць апавяданняў.

Жанрава-стылявыя пошукі ў адлюстраванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Дзіцячае бачанне як спосаб выяўлення і асэнсавання рэчаіснасці – кніга пісьмаў-успамінаў дзяцей «Ніколі не забудзем» (1948). Гісторыя стварэння. Вобразы дзяцей і дарослых. Якуб Колас, Янка Брыль пра кнігу. Янка Брыль пра кнігу.

Майстэрства Васіля Віткі як апавядальніка («Трывога ў Ельнічах», «Стасева падарожжа», «Абнова», «Зайчык-вадалаз», «Першая пяцёрка»). Юны герой у розных

дачыненнях да людзей і прыроды. Рэдактарская дзейнасць Васіля Віткі ў часопісе «Вясёлка». Васіль Вітка – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы, уладальнік міжнароднага Ганаровага дыплома імя Х. К. Андэрсана.

Свет дзяцінства ў апавяданнях В. Гарбука (зборнікі апавяданняў «Незнарок і знарок», «Такіх кветак не бывае», «Горад без папугайчыкаў»), У. Юрэвіча («Тараскавы турботы», «Дзе начуе сонца», «Нястрашны страх»). Наватарскія пошукі А. Вольскага ў галіне тэм і жанраў. Спалучэнне паэзіі, прозы і драматургіі ў кнізе «Лясныя мастакі» (1973).

Апавяданне ў сучаснай беларускай літаратуры для дзяцей. Пазнавальны і выхаваўчы патэнцыял апавяданняў П. Місько пра прыроду «Восеньскім днём», «Лясныя дарункі». Маральна-этычная праблематыка апавяданняў «Добры чалавек», «Каляндар сумлення».

Дзіцячы свет у апавяданнях У. Ліпскага (зб. «Рыгоркавы прыгоды», «Марынчына казка» і інш.). Псіхалагізм, жыццёвасць сітуацый, адметнасць вобразаў. Рэдактарская дзейнасць У. Ліпскага ў часопісе «Вясёлка». У. Ліпскі – лаўрэат Літаратурных прэмій імя Янкі Маўра, імя Васіля Віткі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

Апавяданні сучасных аўтараў на старонках часопіса «Вясёлка».

*Жанр апавядання ў рускай літаратуры.* Майстэрства К. Ушынскага як апавядальніка. «Четыре желания», «Бишка», «Как рубашка в поле выросла» ў вучэбных кнігах «Детский мир» (1861) і «Родное слово» (1864), кампазіцыя, стылёвыя асаблівасці апавяданняў. Педагагічныя погляды Л. Талстога, работа над кнігамі «Азбука» (1872), «Новая азбука» і «Книги для чтения» (1875), тэматычная і жанрава-стылёвая разнастайнасць апавяданняў пра дзяцей, змешчаных у іх. Значэнне творчасці К. Ушынскага і Л. Талстога ў развіцці дзіцячай літаратуры.

Вобразы дзяцей у апавяданнях А. Чэхава «Ванька», «Детвора» і інш. Індывідуалізацыя характараў маленькіх герояў. Пытанні выхавання дзяцей. Аўтарскі падтэкст, глыбіня вывадаў. Каштоўнасць апавяданняў А. Чэхава для сучаснага юнага чытача. Творы М. Горкага для дзяцей: «Случай из Мишкиной жизни», «Воробьишко», «Случай с Евсейкой», выразнасць, эмацыянальная сіла ўздзеяння, аптымістычны пафас твораў. Вобразы дзяцей у апавяданнях Д. Маміна-Сібірака, А. Купрына, прыёмы стварэння характараў.

Маральна-этычная накіраванасць твораў В. Асеевай «Волшебное слово», «Три товарища», «Сыновья», «Просто старушка». Гумарыстычнае апавяданне ў творчасці М. Носава («Мишкина каша», «Фантазёры»), В. Драгунскага («Денискины рассказы»). Гераіка і гумар у апавяданні Л. Панцялеева «Честное слово», вобразы маленькіх дзяцей у апавяданнях «Буква ТЫ», «Настенька». Адметнасць стылю Ю. Якаўлева, С. Аляксеева, А. Алексіна, Р. Пагодзіна, В. Галяўкіна, Ю. Каваля.

*Жанр апавядання ў замежнай літаратуры.* Раскрыццё маральнага вобліку героя праз адносіны да жывёл у апавяданнях амерыканскага пісьменніка М. Калагена «Деловое предложение». Пошукі падлеткам уласнага шляху ў апавяданні венгерскага пісьменніка Ш. Татаі «Мишка находит свою дорогу». Праблема адчужанасці ва ўзаемаадносінах бацькоў і дзяцей у апавяданні аўстралійскага пісьменніка В. Палмера «Улов». Хрысціянскія матывы ў цыкле К. Льюіса «Хроники Нарнии» (1950–1956). Апавяданні для дзяцей сучасных пісьменнікаў У. Старка, К. Рыдэла, П. Сцюарта, К. Ваненгута, М. Мэй.

### 3.2. Аповесць для дзяцей і пра дзяцей

*Жанр аповесці ў беларускай літаратуры.* Распрацоўка Янкам Маўрам жанраў

прыгодніцкай аповесці («У краіне райскай птушкі», «Сын вады»). Зварот да нацыянальнай тэматыкі, праблема чалавека і прыроды ў аповесці «Палескія рабінзоны» (1930), творчая распрацоўка Янкам Маўрам традыцыйнага сюжэта рабінзанады.

Жанрава-стылявыя пошукі ў адлюстраванні тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Творчасць літаратараў – «дзяцей вайны». Арыентацыя на перажытае ў аповесцях Б. Сачанкі «Апошнія і першыя» (1969), В. Казько «Суд у Слабадзе» (1979). Матывы сіроцтва, трагічных стратаў, болю, памяці.

«Напаўфантастычная» аповесць П. Місько «Прыгоды Бульбобаў» (1977). Праблемы сяброўства, чалавечых узаемаадносін у творы. Гумарыстычная аповесць «Навасёлы, або Праўдзівая, часам вясёлая, часам страшнаватая кніга пра незвычайны месяц у жыцці Жэні Мурашкі» (1972). Элементы прыгодніцтва ў творы. Арыгінальныя сюжэты, казачная плынь, прыгодніцкія элементы ў аповесцях У. Ліпскага «Рыгоркавы прыгоды», «Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска» (1982), «Пра Андрэйку Добрыка і чорціка Дуроніка» (1993), «Каралева белых прынцэс» (2000).

*Жанр аповесці ў рускай літаратуры.* Гумарыстычныя аповесці М. Носава пра дзяцей. Адносіны аўтара да персанажаў, сцвярджэнне актыўнай жыццёвай пазіцыі ў творах «Весёлая семейка» (1949), «Витя Малеев в школе и дома» (1950), «Дневник Коли Синицына» (1950). Фантастычныя аповесці пра Алісу Кіра Булычова. Аповесці для дзяцей на сучасным этапе: «Вирус ворчания» (2006) С. Махоціна, «Славкины истории: и в шутку и всерьёз» (2008) В. Грошавай.

*Жанр аповесці ў замежнай літаратуры.* Майстэрства М. Твэна – псіхолага і сатырыка ў аповесцях «Приключения Тома Сойера» (1876), «Приключения Гекльберри Финна» (1884). Паэтызацыя дзяцінства, маральная чысціня герояў, пранікненне ва ўнутраны свет дзіцяці, гумар, лірызм.

Адлюстраванне свету дзяцінства, абарона правоў дзіцяці ў рэалістычных аповесцях А. Ліндгрэн. Апрацоўка вядомага нямецкага фальклорнага матыву ў аповесці Д. Круса «Тим Талер, или Проданный смех».

Актуальныя пытанні дзяцінства, праблема сацыялізацыі дзіцяці ў аповесці аўстралійскага пісьменніка А. Маршала «Я умею прыгать через лужи» (1987).

Фарміраванне характару дзіцяці ў творах французскіх пісьменнікаў А. Баско «Малыш и река» (1945), Ж.-К. Мурлёвай «Река, текущая вспять» (2006). Сучасная замежная аповесць для дзяцей.

### 3.3. Жанр аўтабіяграфічнай аповесці

Руская аўтабіяграфічная проза як традыцыйны жанр дзіцячай літаратуры. Аўтабіяграфічныя аповесці «Детство» (1852) Л. Талстога, «Детство Никиты» (1920) А. Талстога, «Детские годы Багрова-внука» (1858) С. Аксакава, «Детство Тёмы» (1892) М. Гарына-Міхайлоўскага, «Детство» (1913) М. Горкага.

Старонкі жыцця Янкі Маўра ў аўтабіяграфічнай аповесці «Шлях з цемры» (першая частка – 1948, другая – 1956, трэцяя – 1957). Вобразы Янкі і маці. Адметнасць кампазіцыі. Маленства З. Бядулі паводле аповесці «У дрымучых лясах» (1940). Старонкі жыцця А. Васілевіч у пенталогіі «Пачакай, затрымайся» (1972), паказ духоўнага станаўлення, фарміравання светапогляду Ганькі Гурновіч. Сюжэтна-кампазіцыйныя асаблівасці пенталогіі, адметнасць стылю.

## ТЭМА 4. НАВУКОВА-ПАЗНАВАЛЬНАЯ ЛІТАРАТУРА ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

### 4.1. Руская і беларуская навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей

Артыкулы і апавяданні навукова-пазнавальнага характару ў вучэбных кнігах К. Ушынскага. Апавяданні Л. Талстога пра жывёл, іх гуманізм, уздзеянне на эмацыянальную сферу чытача. Засваенне традыцый анімалістычнага жанра ў прозе А. Чэхава, Д. Маміна-Сібірака, А. Купрына. Навукова-паэтычнае асэнсаванне прыроды ў творах М. Прышвіна, К. Паўстоўскага, Б. Жыткова, Я. Чарушына, В. Біянкі.

Навукова-пазнавальная аповесць Янкі Маўра «Чалавек ідзе» (1926). Апісанне клімату, жывёльнага, расліннага свету, жыцця першабытных людзей. Элементы казачнасці ў творы. Тэма «чалавек і прырода» ў прыгодніцкай аповесці У. Дубоўкі «Як Алік у тайзе заблудзіўся» (1974). Асаблівасці падачы пазнавальнага матэрыялу.

Элементы публіцыстыкі ў краязнаўчых кнігах В. Вольскага «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968), «Палессе» (1971). Цыклы прыродазнаўчых нарысаў пісьменніка «Па лясных сцежках», «Дзень добры, Бяроза», «Чайкі над Нараччу».

«Зямля пад белымі крыламі» (1977) У. Караткевіча – эмацыянальна-ўзнёслы сказ пра Беларусь. Нарыс пісьменніка «Белавежская пушча» (1975). Гістарычнае мінулае і сённяшні дзень роднай зямлі, непаўторная прырода Беларусі ў кнізе Я. Пархуты «Зямля бацькоў нашых». Праблемы экалогіі ў нарысах.

Тэма далёкага мінулага Беларусі ў гісторыка-пазнавальнай кнізе У. Ягоўдзіка «Сем цудаў Беларусі» (1999). Фальклорная аснова апавяданняў і нарысаў У. Ягоўдзіка, прысвечаных роднай прыродзе (кнігі «Ці вернецца князь Кук?», «У царстве Вадзяніка», «Дзівосны карабель», «Птушыная дарога» і інш.). Выхаванне экалагічнай культуры і цікавасці дзяцей да пазнання прыроды. Сучасная навукова-пазнавальная кніга для дзяцей.

### 4.2. Развіццё жанраў замежнай навукова-мастацкай літаратуры

Прырода і чалавек у творах амерыканскіх і канадскіх пісьменнікаў Э. Сэтан-Томпсана, Д. Кервуда, Р. Джэрэла. Спецыфіка анімалістычных апавяданняў Э. Сэтан-Томпсана. Гумарыстычная накіраванасць кніг Д. Дарэла. Своеасаблівасць творчай манеры Д. Р. Кіплінга. Апавяданні цыкла «Кроткий зверинец» М. Жэневуа, «Дрозды» Т. Інуі, іх роля ў фарміраванні ў дзяцей адчування далучанасці да прыроды. Роля навукова-мастацкіх кніг у развіцці і выхаванні дзяцей.

## ТЭМА 5. ПАЭЗІЯ Ў ДЗІЦЯЧЫМ ЧЫТАННІ

### 5.1. Беларуская паэзія для дзяцей

А. Гурыновіч – першы беларускі паэт, які адрасаваў свае творы дзецям. Паэтызацыя прыроды ў вершах М. Багдановіча. Дзіцячы свет у вершах Цёткі «Сынок маленькі», «Сірацінка», паэтызацыя прыроды ў вершах «Лес», «Мой сад».

Цеплыня, непасрэднасць, эмацыянальная танальнасць, лірызм, сувязь з традыцыямі беларускага дзіцячага фальклору як адметныя рысы творчасці Янкі Купалы для юнага чытача. Вершы Янкі Купалы на старонках часопіса «Зоркі» (1921–1922): «Песня і казка», «Мароз», «Бай», «Сын і маці». Думка аб неабходнасці спалучэння ў дзіцячай літаратуры казачнага з рэалістычным («Песня і казка»). Абуджэнне ў дзяцей пачуцця нацыянальнай годнасці, выхаванне любові да роднай зямлі, да роднай мовы – верш «Сын і маці». Сугучнасць думак верша нашаму часу. Паэтызацыя красы зімовай прыроды ў вершы «Мароз». Традыцыі фальклорнай паэтыкі ў творчасці Янкі Купалы. Вершы Янкі Купалы 1930-х гг. для юных чытачоў. Выкарыстанне фальклорных матываў і танцавальнай рытмікі ў вершы «Дзіцячае».

Заахвочванне дзяцей да вучобы. Гісторыя напісання верша «Хлопчык і лётчык». Паэтызацыя духоўнага свету юнага героя: цікаўнасць, прага ведаў, імкненне пранікнуць у таямніцы сусвету. Пераклад верша на рускую мову М. Ісакоўскім.

Пейзажныя вершы Якуба Коласа для дзяцей: «На полі вясной», «На рэчцы зімою», «Песня аб вясне», «Дзед-госць», «Зіма», «На лузе», «Дуб», «Ручэй» і інш. Меладычнасць, высокая культура верша. Майстэрства паэта-псіхолага ў сатырычным вершы «Савось-распуснік» (1926). Традыцыі Коласава майстэрства ў сучаснай літаратуры для юнага чытача.

Паэзія З. Бядулі для маленькага чытача: «Мае забавы», «Гаспадарка», «Дудачка», «Калыханка», «Вясной», «Сняжыначкі» і інш. Гармонія чалавека і прыроды. Песенная, музычная інструментоўка вершаў. Дынамічнасць сюжэтаў, графічная выразнасць малюнкаў, вобразнасць мовы.

Маральна-этычныя праблемы ў вершах С. Шушкевіча «Хрыпаты пеўнік», «Свавольнікі», «Непамыцька – хлопчык Віцька» і інш. Тэма працы ў вершах «Пчала-госцейка лятала», «Казка-быль пра рэпку», «Муха-папрадуха», «Трутні», «Працавітыя швачкі». Паэтызацыя прыроды ў вершах «Ляціце, птахі», «Вясна прыйшла», «Усё зіма заснежыла», «Кветачкі-званочкі». Вершы-жарты «Колькі кіпцікаў у кошкі», «Збіралася ліса ў госці», «Рагатыя бэкі-мэкі» і інш. Асаблівасці паэтыкі вершаў С. Шушкевіча: канкрэтнасць паэтычнага вобраза, дакладнасць рыфмы, інтанацыйнае багацце, меладычнасць.

Тэматычная і жанравая шматстайнасць творчасці Эдзі Агняцвет: кнігі «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя» (1976), «Доктар Смех» (1977), «Ад зярнятка да вясёлкі» (1981), «Рэчка, рэчанька мая» (1991), «Хай часцей смяюцца дзеці» (1997), «Пад сінім небасхілам» (1999). Паэтызацыя працы (вершы «Мой тата – будаўнік», «Машыніст», «Хто пачынае дзень?»). Пейзажныя вершы («Музыка лесу», «Падарожнік»). Тэма аховы прыроды («Рабінка», «Чаму ў трывозе дзед Мароз», «Рэчка, рэчанька мая»). Сатырычна-гумарыстычныя вершы («Параска і падказка», «На дачы ў гамаку», «Шчодры Цішка», «Вельмі “ветлівы” Мікіта»). Асуджэнне гультайства, сквапнасці, ганарлівасці. Разнастайнасць адценняў камічнага: ад мяккага гумару да самакрытычнай іроніі. Высокая арганізацыя паэтычнага радка, меладычнасць вершаў паэтэсы.

Наватарскія пошукі А. Вольскага ў галіне тэм і жанраў. Аналіз кніг «Чарнічка» (1964), «Карусель» (1996), «Адэльчыны ручнікі» (2002). Паэтызацыя прыроды ў вершах «Едзе хмарка», «Ялінка», «Зімовае сонца». Прыём антрапамарфізму ў вершах «Коцік», «Козачка», «Бегемоцік». Гумарыстычныя вершы «Захварэў парсючок», «Што чарніла нарабіла», займальнасць сюжэтаў. Асаблівасці вершаваных азбук А. Вольскага «Жывыя літары», «Ад А да Я – прафесія мая».

Тэматычная разнастайнасць паэзіі А. Грачанікава. Аналіз кнігі «Перазвоны азёр і бароў» (1998). Свет дзяцінства і прыроды ў вершах А. Лойкі (кнігі «Як Тоня рэха шукала», «Карагод дзівосных прыгод»). Займальнасць сюжэта, метафарычнасць мовы, цеплыня інтанацый, меладычнасць паэтычнага радка.

Народныя ідэалы дабрыні, сумленнасці, прыгажосці ў вершах і жартах В. Зуёнка (кнігі «Хата, поўная гасцей», «Рэха»). Загадкі В. Зуёнка пра звярыны, птушыны і раслінны свет («Сонечны клубочак»). Тонкае адчуванне гукаў, колераў, фарбаў жывой народнай мовы. Характэрныя прыкметы паэзіі В. Зуёнка – рытмічная разнастайнасць, лёгкасць гучання, імклівасць, насычанасць дзеяннем.

Тонкае разуменне асаблівасцей дзіцячага ўспрымання свету: вершы Максіма Танка «Падслуханае», «Божыя кароўкі», «Магчыма, не чулі», «Чаму птушкі

лётаюць», «Красуня», «Мама». «Лемантар» Максіма Танка як вандроўка па моўных сховах. Метафарычнасць, асацыятыўнасць, нацыянальны каларыт вершаў Максіма Танка ў зборніку «Блікі сонца» (1997).

Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі) у апрацоўцы Васіля Віткі (зб. «Дударык», «Чытанка-маляванка», «Ладачкі-ладкі», «Дом, дзе жывуць словы», «Урокі роднага слова»). Творы з уласна аўтарскім сюжэтам у гэтых кнігах. Вершы на арніталагічную тэматыку. Паэма «Беларуская калыханка» як патрыятычная песня ў гонар маці Радзімы і яе бессмяротных сыноў. Умоўнасць і сімволіка. Высокая паэтычная культура, спалучэнне заснаваных на народна-паэтычнай глебе займальнасці і пазнавальнасці як адметныя рысы творчасці Васіля Віткі. Васіль Вітка – лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Ганаровага дыплома імя Х. К. Андэрсана.

Характэрныя асаблівасці сучаснай беларускай паэзіі – творчае развіццё фальклорных традыцый на новай, адпаведнай нашаму часу, аснове. Жанравае багацце паэзіі – паэмы, вершы, калыханкі, пацешкі, загадкі, задачкі, скорагаворкі, песні. Шырыня тэматыкі: вершы аб Радзіме, прыродзе, працы, пра дзяцінства. Педагагічная накіраванасць, гумар і лірызм твораў, даступнасць дзіцячаму ўспрыманню.

Фальклорныя матывы і жанры ў паэзіі Н. Гілевіча. Займальнасць, мастацкая дасканаласць загадак (зб. «Сіні домік, сіні дом», «Загадкі»). Свет прыроды і дзяцінства ў вершах «Дождж-грыбасей», «У лузе», «Зёлкі», «Хто з бабуляй пойдзе ў лес?» (зб. «Калі рана ўстанеш», «Добры чалавек», «Шчаслівыя хвіліны»). Мастацкае асэнсаванне пачуцця гонару за права «беларусам звацца» – верш «Казачная зямля». Творы, напісаныя Н. Гілевічам па матывах балгарскай дзіцячай паэзіі («Белы мядзведзь у заапарку», «Песня пра ручаёк», «За што мяне мама не пацалавала?» – кніга «Добры чалавек»).

Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна (вершы, калыханкі, пацешкі, жарты, скорагаворкі, лічылкі, задачкі, загадкі, казкі). Здольнасць паэта гуляць словам, уменне віртуозна карыстацца гукапісам, каламбурыць. Агляд кніг: «Ай! Не буду! Не хачу!» (1971), «Ці пазяхае бегемот?» (1981), «Індыкала-кудыкала» (1986), «Грышка, Мішка і Шчыпай ехалі на чоўне» (1996), «Як воўк калядаваў» (2000), «Выпаў грук у грома з рук» (2009), «Сябрына» (2013). Асаблівасці азбукі «Азбука – вясёлы вулей» (1995). Спосабы актывізацыі мастацкага мыслення дзяцей: вершы-пытанні, камічныя сітуацыі («Ці пазяхае бегемот?», «Хто дагары нагамі?», «Ці аса, ці куса?», «Як быць?», «Ты чуў? Ты чула?», «Пільная патрэба», «Рэгуліроўшчык», «Ён, яна, яно, яны», «Як стаў заяц даўгавухі», «Буду ўрачом»). Наватарства формы твораў. Вершы-загадкі («Загадкі на градках», «Кош загадак»), скорагаворкі («Скорагаворка са скорагаварчаняткам», «Вымаві!»), задачкі («Палічы!», «Як сурок лічыў сарок?», «Колькі кошак у кашы?», «Колькі важыць зайцаў цень?», «Колькі сарок?», «Колькі мае ног?»), дражнілкі («Як дражніць бубнілу?», «Пыталава»), прыбабунькі («Не столькі мліва, колькі дзіва»). Вершы-каламбуры («Што было б тады б, калі б?», «Колькі раніц месціць ранец?», «На шашы», «Варголы»). Свет маленства ў вершах «Ай! Не буду! Не хачу!», «Раскідач», «Пытанне ўсім» і інш. Вершы пра жывёл і птушак («Экзамен», «Ці ляцяць вароны ў вырай?», «Пеўнік-весялун»). Трапнасць характарыстык. Прыём антрапамарфізму. Лірычнасць пейзажных замалёвак («Як восень дрэвы ашукала», «Зіма», «Коцікі», «Босы дождж»). Роля паэзіі Р. Барадуліна ў абуджэнні цікавасці да роднага слова, чуйнасці да яго гучання, выхаванні ў дзяцей назіральнасці і пачуцця прыгожага.

Нацыянальная адметнасць творчасці В. Жуковіча (зб. «Гуканне вясны», 1992;

«Свет – дзівосны», 2000), У. Карызны («Іграй, жалейка, не змаўкай…», 1998), Л. Пранчака («Дзяўчынка-беларуска», 1993; «Цік-так ходзікі», 2001), В. Лукшы «Адзіны ў свеце край» (2004), М. Пазнякова («У родным краі», 2009; «Радзіма», 2012, «Серабрыстыя чайкі», 2013).

Агляд паэтычных зборнікаў: А. Дзеружынскага «Жывая азбука» (1995), І. Курбекі «Хітрыя літары» (2004), М. Чарняўскага «Сонечны кошык» (2009), «Колькі ў сонейка сяброў!» (2009), «Як зрабіць вясёлым дзень» (2012), У. Паўлава «Хто знае – адгадае» (1997), «Згадка на дабро» (2004), В. Гардзея «Зайкава балалайка» (1998), М. Маляўкі «Марфутка-імянінніца» (2008), У. Мацвеенкі «Дабранач» (2003), «Староначкі з моўнай скарбоначкі» (2008), «Займальны родны алфавіт» (2013), У. Мазго «Цуда-вуда» (2008), «Загадкавая азбука» (2012), «Лепшыя сябры» (2012), М. Пазнякова «Песня прыроды» (2012), «У бары і на двары» (2012), Н. Галіноўскай «Звяры ў трамваі» (2013) і інш. Зварот да фальклору і пошукі новых жанравых форм.

### 5.2. Руская паэзія для дзяцей

Пейзажная лірыка рускіх паэтаў першай паловы XIX ст. у дзіцячым чытанні: развіццё паэтычнага слыху, узбагачэнне эмацыянальна-вобразнага ўспрымання дзіцяці, выхаванне любові да прыроды. Творы І. Крылова, В. Жукоўскага, А. Пушкіна ў дзіцячым чытанні. Балады і вершы В. Жукоўскага «Птичка», «Жаворонок», іх значэнне ў маральным і эстэтычным выхаванні дзяцей. Паэзія А. Пушкіна для чытачоў дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Значэнне твораў А. Пушкіна ў развіцці дзіцячай літаратуры.

Лірыка другой паловы XIX ст. Агляд зборнікаў вершаў А. Пляшчэева «Подснежник», «Дедушкины песни». Мастацкія вартасці твораў. Карціны прыроды ў творчасці паэта («Травка зеленеет…», «Родное», «Летние песни», «Дети и птичка», «Осень», «Мой садик»). Раскрыццё цеснай сувязі дзіцяці з прыродай у вершах І. Сурыкава «Детство» («Вот моя деревня…»), «В ночном», «На реке», «Белый снег пушистый», «Ярко светит солнце»). Пейзажная лірыка Ф. Цютчава, А. Майкова, А. Фета, І. Нікіціна ў дзіцячым чытанні. Традыцыі і наватарства ў паэзіі для дзяцей А. Блока, В. Брусава, І. Буніна.

Развіццё паэзіі пад уздзеяннем футурыстаў У. Маякоўскага, В. Хлебнікава. Вершы У. Маякоўскага для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту («Тучкины штучки», «Гуляем», «Что такое хорошо и что такое плохо», «Кем быть?»). Выкарыстанне яркіх неалагізмаў, моцных метафар, складаных рыфмаў, эмацыянальнасць вершаў. Прыход паэтаў групы «ОБЭРИУ» Д. Хармса, А. Введзенскага, М. Забалоцкага, Ю. Уладзімірава. Вершы Карнея Чукоўскага, іх роля ў выхаванні паэтычнага слыху дзяцей. Класічнае даследаванне творчых магчымасцей дашкольнікаў: «От двух до пяти» (1933). Уплыў К. Чукоўскага на творчасць В. Берастава, Э. Машкоўскай, Б. Захадэра, Г. Сапгіра.

Жанравая і тэматычная разнастайнасць твораў С. Маршака: дзіцячыя песенькі, вершы, загадкі, лічылкі, паэмы. Прастата стылю, лаканізм мовы, займальнасць вершаў «Детки в клетке», «Про всё на свете», «Цирк», «Сказка о глупом мышонке», «Вот какой рассеянный», «Мяч», «Усатый-полосатый», «Пожар», «Вчера и сегодня». Мажорная інтанацыя, энергічнае развіццё думкі, насычанасць фарбаў, захапляльныя нечаканасці ў развіцці сюжэта. Гумар і сатыра ў творах С. Маршака. «Весёлая азбука», «Весёлый счёт», «Весёлое путешествие от А до Я», «Разноцветная книга». Іх пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. Вершы на школьныя тэмы: «Школьнику на память», «Живые буквы».

Псіхалагічныя аспекты паэзіі А. Барто, разнастайнасць тэматыкі твораў:

сатырычныя вершы «Девочка чумазая», «Девочка-рёвушка» (1930), «Любочка», «Лёшенька», «Качели» (1948); маральныя паводзіны дзіцяці ў вершах для самых маленькіх «Машенька», цыкл «Игрушки» (1936); тэма працы «Дом переехал» (1938). Кніга для малодшых школьнікаў «За цветами в зимний лес» (1972). Наватарства вершаў, лірызм. Творы А. Барто ў малюнках В. Гараева, М. Мітурыча. Традыцыі А. Барто ў творчасці І. Такмаковай і сучасных паэтаў.

Шматжанравасць мастацкай творчасці С. Міхалкова: лірычныя, сатырычныя, публіцыстычныя вершы, байкі, паэмы. Вобраз станоўчага героя ў тэтралогіі «Дядя Стёпа» (1935–1978). Мастацкае наватарства, пазнавальная і выхаваўчая каштоўнасць паэмы. Напеўнасць, жыццясцвярджальны гумар у вершах «Мой щенок», «Как старик корову продавал», «Чистописание». Сатырычныя вершы «Фома», «Про мимозу». С. Міхалкоў – лаўрэат Ганаровага дыплома імя Х. К. Андэрсана.

Здабыткі паэзіі А. Благінінай, Л. Касіля, Б. Захадэра, В. Берастава, Г. Сапгіра, І. Такмаковай, Р. Сефа, Г. Остэра.

Шырыня тэматыкі, жанравая разнастайнасць сучаснай рускай паэзіі для дзяцей. Педагагічныя задачы і спецыфіка іх вырашэння, гумар, лірызм, арыентацыя на ўспрыманне дзіцяці.

### 5.3. Замежная паэзія для дзяцей

Малыя жанры англійскага фальклору: песні, небыліцы ў перакладах С. Маршака, К. Чукоўскага, І. Такмаковай, Б. Захадэра. Англійская паэзія для дзяцей у зборніку «В один прекрасный день» у перакладзе М. Барадзіцкай. Э. Лір – пачынальнік літаратуры нонсэнса і стваральнік жанра лімерыка. «Книга нелепиц» (1846). Вершаваныя небыліцы Э. Ліра ў перакладзе С. Маршака (зб. «Прогулка верхом»). Паэтыка вершаў А. Мілна і яе аднаўленне ў перакладах С. Маршака, Г. Сапгіра. Амерыканская паэзія абсурда ў перакладах на рускую мову Б. Захадэра, Р. Сефа. Вершы Д. Радары «Чем пахнут ремёсла», «Про всё на свете» ў перакладах С. Маршака. Гульнёвая паэзія французскіх аўтараў Ж. Прэвера, Р. Дзеснаса, М. Лей, К. Руа, Р. Абальдзіа ў перакладах В. Берастава, М. Кудзінава, М. Яснова ў зб. «Стихи французских поэтов для детей» (2006). Жанрава-тэматычная разнастайнасць польскай паэзіі. Вершы на маральна-этычную праблематыку Ю. Тувіма ў перакладах С. Маршака, С. Міхалкова. Выкарыстанне слоўнай гульні, засваенне традыцый жанру байкі ў паэзіі Я. Бжэхвы (зб. «Веселые стихи», «На Горизонтских островах») у перакладзе Б. Захадэра. Спецыфіка азнаямлення дзяцей з паэзіяй.

## ТЭМА 6. ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ ЖАНРАЎ ДЗІЦЯЧАЙ ДРАМАТУРГІІ

### 6.1. Адметнасць беларускай лзіцячай драматургіі

Жанрава-стылёвыя тэндэнцыі ў беларускай драматургіі для дзяцей. К. Лейка – пачынальнік нацыянальнай драматургіі. Казачны сюжэт п’есы «Снатворны мак» (1912). Адухоўленыя вобразы кветак (Мак, Званочак, Ружа, Разяда). Асуджэнне сквапнасці, хітрасці і здрадніцтва. Выяўленне гуманістычных ідэалаў аўтара.

Услаўленне справядлівасці, міласэрнасці, дабрыні ў п’есах А. Гаруна «Хлопчык у лесе» і інш. (зб. «Жывыя казкі для дзіцячага тэатру»). Фальклорная аснова п’ес «Цудоўная дудка» (1938), «Дзед і жораў» (1939) В. Вольскага. Сцэнічнае жыццё. Фальклорная аснова, выхаваўчая накіраванасць п’ес А. Вольскага «Сцяпан – Вялікі Пан» (1979, пакладзена на музыку Ю. Семянякам і пастаўлена ў 1979 г. на сцэне Мінскага тэатра музычнай камедыі), «Каб не змаўкаў жаваранак» (1989).

Маральна-этычная праблематыка п’ес-казак У. Ягоўдзіка «Сонейка, свяці!», «Залатое зярнятка», «Сакрэты Вогніка», «Калі тупне зайка...», «Усміхніся, прынцэса!»

Фальклорныя матывы, вобразы, элементы прыгодніцтва ў п’есах В. Лукшы «Чароўны камень» (1984), З. Дудзюк «Жывая вада» (1994), «Дудка-самагудка» (2001), П. Васючэнкі «Новы калабок» (1996), «Страшнік Гам» (1994), Г. Каржанеўскай «Шукайце кветку-папараць» (2004), «Вандраванне ў Княства Сноў» (2009). Адметная сюжэтна-вобразная структура п’ес.

Зварот да жанру «фэнтэзі»: «Канікулы на астэроідзе», «Сінязорка» З. Дудзюк, «Міжпланетны пажарнік», «Шкляныя горы, альбо Праграміст Чароўнай даліны» Р. Баравіковай, «Кацярынка і Кэт» П. Васючэнкі, «Калі прыляцелі іншапланецяне» Т. Мушынскай. Спробы ўвасаблення «рыцарскай тэмы» ў п’есах П. Васючэнкі «Маленькі збраяносец» (1997), Л. Рублеўскай «Янук, рыцар Мятлушкі» (1994).

Чалавек і прырода ў п’есах «Калі дракон прачнуўся» М. Арахоўскага, «Чароўны гадзіннік» («Гадзіннік Лікбога») З. Дудзюк; экалагічныя праблемы ў п’есах «Каляровая затока» П. Васючэнкі, «Кветкі пад ліўнем» І. Сідарука, «Зімовая песня жаўрука» Г. Марчука. Знаходкі ў наследаванні традыцый сусветнай літаратуры. Выкарыстанне літаратурных крыніц для стварэння новых узораў сцэнічных твораў для дзяцей: «Спадчына бабулі Зімавухі» Л. Рублеўскай – «Снежная каралева» Х. К. Андэрсана, «Зорны хлопчык» Г. Каржанеўскай – «Маленькі прынц» А. Сэнт-Экзюперы, «Віртуальнае зубраня» І. Сідарука – эпізоды з паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра», «Як птушкі дуб ратавалі» Г. Каржанеўскай – «Казкі жыцця» Якуба Коласа.

П’есы-казкі для лялечнага тэатра М. Захаранкі «Разумная ўнучка» (2000), «Лясныя сваты» (2001), «Пакрыўджаны дзед» (2002) і інш. Жанравая разнастайнасць сучаснай беларускай дзіцячай драматургіі, багацце форм узаемадзеяння жыццёвага і казачнага матэрыялу, тэндэнцыя да жанравага сінтэзу, высокі эстэтычны ўзровень, выразная гуманістычная накіраванасць.

Разнастайнасць жанраў рускай дзіцячай драматургіі. Драматургія XVIII–XIX ст. для дзяцей. Уздзеянне лубачнай літаратуры і народнага тэатра на развіццё дзіцячай драматургіі. Матывы казачнага фальклору ў п’есе-казцы С. Маршака «Кошкин дом». П’еса-казка «Двенадцать месяцев» (1943) аб перамозе дабра, працалюбстве і смеласці (па матывах славацкай казкі). Узбагачэнне жанру п’есы-казкі ў творчасці Т. Габэ, С. Міхалкова. Традыцыйнае і наватарскае ў творчасці Я. Шварца: п’есы-казкі «Сказка о потерянном времени» (1940), «Два клёна» (1953), «Обыкновенное чудо» (1954) і інш., п’есы па матывах казак Х. К. Андэрсана. Разнастайнасць жанраў сучаснай дзіцячай драматургіі, тэндэнцыя да жанравага сінтэзу.

Заканамернасці існавання і развіцця жанраў замежнай драматургіі. Традыцыі камедыі масак у казках для тэатра К. Гоцы. Узаемадзеянне фантастычнага і сатырычнага, роля імправізацыі. Праблематыка і жанравая спецыфіка феерыі Д. Бары «Питер Пэн», рысы парадаксальнага мыслення. Філасофска-гуманістычная накіраванасць п’есы-казкі М. Метэрлінка «Синяя птица» (1908), шматзначнасць сімволікі, паэтычнасць мовы. Жанравая спецыфіка п’ес-жартаў П. Грыпары «Семь пьес-шуток» (1992). Распрацоўка сінтэзных і сінкрэтычных мастацкіх жанраў як вядучая тэндэнцыя ў развіцці сучаснай замежнай дзіцячай драматургіі.

## ТЭМА 7. ЖАНР ІЛЮСТРАЦЫІ Ў ДЗІЦЯЧАЙ КНІЗЕ. СУЧАСНЫЯ ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

### 7.1. Дзіцячая ілюстраваная кніга

Дзіцячая кніга ў эстэтычным і маральным выхаванні чытача. Роля мастацкага

афармлення кнігі для дзяцей. Ілюстрацыя як сродак актыўнага ўспрымання і засваення літаратурнага твора. Ілюстрацыя ў букварах і азбуках XVII–XIX ст.

Дзіцячая ілюстраваная кніга XX ст. Удзел у афармленні выданняў для дзяцей беларускіх мастакоў-ілюстратараў А. Лось, Т. Беразенскай, П. Татарнікава, У. Жука, С. Волкава і інш. Пошукі мастацкай выразнасці. Рускія мастакі-ілюстратары дзіцячай кнігі У. Лебедзеў, Я. Чарушын, В. Канашэвіч, Я. Рачоў, А. Пахомаў, У. Суцееў, М. Папоў, А. Траўгот і В. Траўгот, В. Фаміна, І. Алейнікаў, І. Аляксандраў, А. Дугін, Г. Юдзін і інш. Выкарыстанне прыёмаў жывапісу, графікі, узаемадзеянне мастацтва кінематаграфіі і мультыплікацыі. Пошукі мастацкай выразнасці замежнымі мастакамі-ілюстратарамі дзіцячай кнігі Доктарам Зюссам, К. Грынвей, Д. Смітам, Д. Груэлем, Г. Дарэ. Неабходнасць асэнсавання гісторыі, тэорыі і практыкі дзіцячай ілюстраванай кнігі, дыскусіі аб яе развіцці, арганізацыя рэгіянальных і міжнародных сімпозіумаў.

Перыядычны друк для дзяцей на сучасным этапе. Выданне часопісаў «Рюкзачишка», «Рюкзачок»: асноўныя раздзелы, тэматыка. Агляд часопіса «Вясёлка»: асноўныя рубрыкі, тэматыка, жанравая разнастайнасць твораў сучасных пісьменнікаў. Часопіс «Буся»: чытацкае прызначэнне, змест, афармленне.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА
## ДЫСЦЫПЛІНЫ «СУСВЕТНАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА» (дзённая форма атрымання адукацыі)

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа студэнта | Матэрыя льнае забеспячэнне заняткаў | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя (семінарскія заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **Сусветная дзіцячая літаратура** | **24** | **24** | **60** | | | |
| 1. | **Спецыфіка дзіцячай літаратуры як мастацтва слова. Вытокі дзіцячай літаратуры** | **2** | | **6** | | | |
| 1.1. | ***Адметнасць дзіцячай літаратуры як мастацтва слова. Дзіцячая літаратура як вучэбны прадмет*** 1. Паняцце аб дзіцячай літаратуры і дзіцячым чытанні. Спецыфіка літаратуры для юнага чытача. 2. Пытанні тэорыі дзіцячай літаратуры. 3. Вусная народная творчасць як першааснова дзіцячай літаратуры. Малыя фальклорныя жанры. Фальклорны эпас. Народная казка: генезіс, спецыфіка жанру, прынцыпы класіфікацыі. 5Станаўленне і развіццё літаратуры для дзяцей на тэрыторыі славянскіх дзяржаў. Першыя рукапісныя і друкаваныя кнігі (азбукі, буквары, азбукоўнікі) і прычыны іх з'яўлення. 6. Кнігі для дзяцей пачатку XVII ст. Першыя апавяданні і | 2 | | 6 | Арзамасцева, И.Н., Николаева, С.А. Детская литература: Учебник для студ. высш. и сред. пед. учеб. заведений / И.Н. Арзамасцева, С.А. Николаева. – М. : Высшая школа, 2011. | Асн. : [1], [2]. Дад. : [4], [5], [6], [7]. | Выкананне творчых заданняў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | аповесці для дзяцей. Развіццё жанру байкі.<br>7. Узнікненне беларускага кнігадрукавання. Фарміраванне асноўных жанраў літаратуры для дзяцей. | | | | | | |
| 2. | **Жанр казкі ў літаратуры для дзяцей** | **6** | **8** | **12** | | | |
| 2.1. | ***Эвалюцыя жанру казкі ў рускай і беларускай літаратуры***<br>1. Жанр літаратурнай паэтычнай казкі.<br>2. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці рускай паэтычнай казкі для дзяцей XX ст.<br>3. Жанр літаратурнай празаічнай казкі.<br>4. Шляхі развіцця беларускай літаратурнай казкі. | 2 | | | Дзіцячая літаратура (беларуская) : вучэб. дапам. / Т. У. Ганчарова-Цынкевіч, С. А. Сычова. – Мінск : БГПУ, 2021. | Асн. : [1], [2]. Дад. : [4], [5], [6], [7]. | Выкананне творчых заданняў |
| 2.1.1. | 1. Агляд кніг серыі «Казкі XXI стагоддзя».<br>2. Агляд серыі «Беларуская аўтарская казка» («Чароўныя пацеркі», «Вежа міру», «Крынічка Буль-Буль», «Казачны куфэрак». | | 2 | | Зборнікі казак | Асн. : [1], [2]. | Экспрэс-апытанне. |
| 2.2. | ***Шляхі развіцця французскай і скандынаўскай літаратурнай казкі***<br>*1. Французская літаратурная казка.*<br>1.1. Ш. Перо – пачынальнік французскай літаратурнай казкі.<br>1.2. Алегарычная аповесць-казка А. Сэнт-Экзюперы «Маленький принц» (1943).<br>1.3. Значэнне пародыі і слоўнай гульні ў «Сказках для непослушных детей» Ж. Прэвера, жанравая навізна кнігі.<br>1.4. Сучасная французская казка.<br>*2. Скандынаўская літаратурная казка.*<br>2.1. Сусветнае значэнне і наватарскі характар казак Х.К. Андэрсена.<br>2.2. Гісторыка-этнаграфічныя і маральныя аспекты | 2 | | 4 | Будур, Н.В., Иванова, Э.И. Зарубежная детская литература / Н.В. Будур, Э.И. Иванова. – М. : Просвещение, 2000. | Асн. : [2]. Дад. : [4], [5,] [6], [7]. | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | рамана-казкі С.А. Лагерлёф «Удивительное путешествие Нильса Хольгерсона с дикими гусями по Швеции».<br>2.3. Жанрава-тэматычная разнастайнасць казак А. Ліндгрэн.<br>2.4. Казачная краіна Мумі-троляў Т. Янсан. | | | | | | |
| 2.2.1. | 1. Вытокі казак Ш. Перо «Сказки моей матушки Гусыни» (1697), іх маральная аснова.<br>2. Узаемадзеянне рэалістычнага і фантастычнага, сур'ёзнага і камічнага ў казках.<br>3. Вобразы станоўчых і адмоўных герояў у казках Ш. Перо.<br>4. Казкі Х.К. Андэрсана.<br>5. Раман-казка С.А. Лагерлёф «Удивительное путешествие Нильса Хольгерсона с дикими гусями по Швеции».<br>6. Жанрава-тэматычная разнастайнасць казак А. Ліндгрэн.<br>7. Краіна Мумі-троляў Т. Янсан. | | 2 | | Казкі Ш. Перо, Х.К. Андэрсана, С.А. Лагерлёф, А. Ліндгрэн, Т. Янсан | Асн.: [2]. Дад.: [4], [5]<br>. | Экспрэс-апытанне. |
| 2.3. | ***Англійская, нямецкая, амерыканская літаратурная казка***<br>1. Э. Лір – пачынальнік літаратуры нонсэнса. «Невероятная история о великанах и эльфах».<br>2. Наватарства Л. Кэрала ў казках «Алиса в стране чудес», «Алиса в Зазеркалье».<br>3. Маральна-філасофскія праблемы ў казках О. Уайльда.<br>4. Анімалістычныя казкі Д.Р. Кіплінга.<br>5. Псіхалогія дзіцяці, словатворчасць у казках А. Мілна.<br>6. Даследаванне свету дзяцінства ў творы Э.Т.А. Гофмана «Щелкунчик и Мышиный король».<br>7. Казкі В. Гаўфа.<br>8. Фантасмагорыя Д. Круса «Тим Талер, или Проданный | 2 | | 8 | Будур, Н.В., Иванова, Э.И. Зарубежная детская литература / Н.В. Будур, Э.И. Иванова. – М. : Просвещение, 2000. | Асн.: [2]. Дад.: [4], [5], [6] | Выкананне праверачных заданняў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | смех».<br>9. Трансфармацыя фальклорных матываў у творчасці О. Пройслера.<br>10. Н. Гаторн – заснавальнік амерыканскай дзіцячай літаратуры.<br>11. Дабрыня і справядлівасць у «Сказках дядюшки Римуса» Д.Ч. Харыса.<br>12. Мастацкія асаблівасці вершаваных казак Доктара Сьюза «Кот в шляпе», «Что я видел на улице», «Сказки про слона Хортона», літаратурных празаічных казак Л.Ф. Баўм «Волшебник из страны Оз», «Чудесная страна Оз», казак К. Ваненгута. | | | | | | |
| 2.3.1. | 1. Казкі Л. Кэрала «Алиса в стране чудес», «Алиса в Зазеркалье».<br>2. Асаблівасці казак О. Уайльда.<br>3. Казкі Д.Р. Кіплінга.<br>4. Адметнасць казак А. Мілна.<br>5. Спецыфіка апрацоўкі народных нямецкіх сюжэтаў братамі Якабам і Вільгельмам Грым.<br>6. Тэматычная разнастайнасць і мастацкія вартасці казак братоў Грым.<br>7. Асаблівасці вершаваных казак Доктара Сьюза «Кот в шляпе», «Что я видел на улице», «Сказки про слона Хортона».<br>8. Адметнасць літаратурных празаічных казак Л.Ф. Баўм «Волшебник из страны Оз», «Чудесная страна Оз», казак К. Ваненгута. | | 4 | | Творы Л. Кэрала, О. Уальда, Д.Р. Кіплінга, А. Мілна, братоў Грым | Асн.: [2]. Дад.: [4], [5], [6]. | Абарона праектаў |
| 3. | **Апавяданне і аповесць для дзяцей у айчыннай і сусветнай літаратуры** | **6** | **4** | **14** | | | |
| 3.1. | ***Жанр апавядання ў літаратуры для дзяцей***<br>1. Жанр апавядання ў літаратуры для дзяцей.<br>2. Жанр апавядання ў беларускай літаратуры. | 2 | | 4 | Дзіцячая літаратура (беларуская) : вучэб. дапам. / | Асн.: [1], | Выкананне праверачных заданняў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Жанр апавядання ў рускай літаратуры.<br>4. Жанр апавядання ў замежнай літаратуры. | | | | Т. У. Ганчарова-Цынкевіч,<br>С. А. Сычова. – Мінск : БГПУ, 2021. | [2].<br>Дад.:<br>[5],<br>[6],<br>[7]. | |
| 3.1.1. | 1. Гуманістычны змест, маральна-этычная праблематыка апавяданняў Цёткі.<br>2. «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» Якуба Коласа.<br>3. Гуманістычны змест апавяданняў Якуба Коласа «Дзеравеншчына», «Сірата Юрка», «У старых дубах».<br>4. Тэматыка, мастацкія асаблівасці апавяданняў З. Бядулі «Пяць лыжак заціркі», «Малыя дрывасекі», «Велікодныя яйкі», «Дзе канец свету?».<br>5. Псіхалагічныя апавяданні Янкі Маўра 30-х гадоў.<br>6. Праблемы маральна-эстэтычнага выхавання ў апавяданнях Янкі Брыля «Жыў-быў вожык», «Чым накармілі Мішутку», «Ліпа і клёнік».<br>7. Тэма «чалавек і прырода» ў апавяданнях А. Васілевіч «Браты-артысты», «Геша», «Бабуліны кватаранты» і інш.<br>8. Майстэрства Васіля Віткі як апавядальніка («Трывога ў Ельнічах», «Стасева падарожжа», «Абнова», «Зайчык-вадалаз», «Першая пяцёрка»).<br>9. Апавяданне ў сучаснай беларускай літаратуры для дзяцей.<br>10. Апавяданні сучасных аўтараў на старонках часопіса «Вясёлка». | | 2 | | Мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў | Асн.:<br>[1],<br>[2].<br>Дад.:<br>[3],<br>[4],<br>[6],<br>[10]. | Экспрэс-апытанне. |
| 3.2. | ***Аповесць для дзяцей і пра дзяцей***<br>1. Жанр аповесці ў беларускай літаратуры.<br>2. Аповесці Янкі Маўра.<br>3. Жанрава-стылявыя пошукі ў адлюстраванні тэмы | 2 | | 6 | Дзіцячая літаратура (беларуская) : вучэб. дапам. / Т. У. Ганчарова- | Асн.:<br>[1],<br>[2]. | Выкананне праверачных заданняў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Вялікай Айчыннай вайны.<br>4. Аповесці П. Міська, У. Ліпскага і інш.<br>5. Жанр аповесці ў рускай літаратуры.<br>6. Гумарыстычныя аповесці М. Носава пра дзяцей.<br>7. Фантастычныя аповесці пра Алісу Кіра Булычова.<br>8. Аповесці для дзяцей на сучасным этапе.<br>9. Жанр аповесці ў замежнай літаратуры. | | | | Цынкевіч, С. А. Сычова. – Мінск : БГПУ, 2021. | Дад. : [3], [5], [6], [10]. | |
| 3.2.1. | 1. Жанр аповесці ў беларускай літаратуры. Распрацоўка Янкам Маўрам жанру прыгодніцкай аповесці.<br>Аповесці П. Міська. Праблемы сяброўства, чалавечых узаемаадносін.<br>2. Арыгінальныя сюжэты, казачная плынь, прыгодніцкія элементы ў аповесцях У. Ліпскага.<br>3. Жанр аповесці ў рускай літаратуры. Гумарыстычныя аповесці М. Носава пра дзяцей. Аповесці для дзяцей на сучасным этапе.<br>4. Сучасная замежная аповесць для дзяцей. | | 2 | | Кнігі Я. Маўра, П. Міська, У. Ліпскага | Асн. : [1], [2]. Дад. : [2], [3], [5], [6]. | Калёквіум. |
| 3.3. | ***Жанр аўтабіяграфічнай аповесці***<br>1. Руская аўтабіяграфічная проза як традыцыйны жанр дзіцячай літаратуры.<br>*2.* Аўтабіяграфічная аповесць у беларускай літаратуры. | 2 | | 4 | Будур, Н.В., Иванова, Э.И. Зарубежная детская литература / Н.В. Будур, Э.И. Иванова. – М. : Просвещение, 2000. | Асн. : [1], [2]. Дад. : [4], [5], [7]. | |
| **4.** | **Навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей** | **2** | **4** | **12** | | | |
| 4.1 | ***Руская і беларуская навукова-пазнавальная літаратура для дзяцей***<br>1. Артыкулы і апавяданні навукова-пазнавальнага характару ў вучэбных кнігах К. Ушынскага. Апавяданні Л. Талстога пра жывёл. | 1 | | 6 | Дзіцячая літаратура (беларуская) : вучэб. дапам. / Т. У. Ганчарова-Цынкевіч, | Асн. : [1], [2]. Дад. | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Навукова-паэтычнае асэнсаванне прыроды ў М. Прышвіна, К. Паўстоўскага, Б. Жыткова, Я. Чарушына, В. Біянкі.<br>3. Навукова-пазнавальная аповесць Янкі Маўра «Чалавек ідзе». Тэма «чалавек і прырода» ў прыгодніцкай аповесці У. Дубоўкі «Як Алік у тайзе заблудзіўся».<br>4. Элементы публіцыстыкі ў краязнаўчых кнігах В. Вольскага, У. Караткевіча.<br>5. Тэма далёкага мінулага Беларусі ў гісторыка-пазнавальнай кнізе У. Ягоўдзіка «Сем цудаў Беларусі». | | | | С. А. Сычова. – Мінск : БГПУ, 2021. | : [4], [5], [9], | |
| 4.1.1 | Прыродаапісальныя апавяданні ў рускай і беларускай літаратурах<br>1. Апавяданні Л. Талстога пра жывёл.<br>2. Прырода ў творах М. Прышвіна, К. Паўстоўскага, Б. Жыткова, Я. Чарушына, В. Біянкі.<br>3. Навукова-пазнавальная аповесць Янкі Маўра «Чалавек ідзе».<br>4. Краязнаўчыя кнігі В. Вольскага, У. Караткевіча.<br>5. Гісторыка-пазнавальная кніга У. Ягоўдзіка «Сем цудаў Беларусі». | | 2 | 4 | Кнігі рускіх і беларускіх пісьменнікаў пра прыроду | Асн. : [1], [2]. Дад. : [4], [5] | Выкананне рознаўзроўневых заданняў. |
| 4.2. | ***Развіццё жанраў замежнай навукова-мастацкай літаратуры***<br>1. Прырода і чалавек у творах амерыканскіх і канадскіх пісьменнікаў Э. Сэтан-Томпсана, Д. Кервуда, Р. Джэрэла.<br>2. Спецыфіка анімалістычных апавяданняў Э. Сэтан-Томпсана.<br>3. Роля навукова-мастацкіх кніг у развіцці і выхаванні дзяцей. | 1 | | | Зарубежная детская литература / Н.В. Будур, Э.И. Иванова. – М. : Просвещение, 2000. | | Напісанне эсэ |
| 4.2.1 | Анімалістычныя творы для дзяцей у замежнай дзіцячай літаратуры | | | 2 | | | |
| | 1. Творы пра ўзаемаадносіны чалавека і прыроды ў творах Э. Сэтан-Томпсана, Д. Кервуда, Р. Джэрэла. | | 2 | | Кнігі замежных пісьменнікаў пра | Асн. : | Падрыхтоўка рэфератаў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 2. Анімалістычныя апавяданні Э. Сэтан-Томпсана.<br>3. Роля навукова-мастацкіх кніг у развіцці і выхаванні дзяцей.<br>4. Своеасаблівасць творчай манеры Д. Р. Кіплінга.<br>5. Апавяданні цыкла «Кроткий зверинец» М. Жэневуа, «Дрозды» Т. Інуі, іх роля ў фарміраванні ў дзяцей адчування далучанасці да прыроды. | | | | прыроду | [2].<br>Дад.<br>:<br>[4]<br>[5],<br>[6],<br>[7]. | |
| **5.** | **Паэзія ў дзіцячым чытанні** | **4** | **4** | **6** | | | |
| 5.1. | ***Беларуская паэзія для дзяцей***<br>1. А. Гурыновіч – першы беларускі паэт, які адрасаваў свае творы дзецям.<br>2. Паэзія З. Бядулі для маленькага чытача.<br>3. Маральна-этычныя праблемы ў вершах С. Шушкевіча.<br>4. Тэматычная і жанравая шматстайнасць творчасці Эдзі Агняцвет.<br>5. Наватарскія пошукі А. Вольскага ў галіне тэм і жанраў.<br>6. Народныя ідэалы дабрыні, сумленнасці, прыгажосці ў вершах і жартах В. Зуёнка.<br>7. Метафарычнасць, асацыятыўнасць, нацыянальны каларыт вершаў М. Танка.<br>8. Вершаваныя жанры дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, лічылкі, загадкі, скорагаворкі) у апрацоўцы Васіля Віткі.<br>9. Фальклорныя матывы і жанры ў паэзіі Н. Гілевіча.<br>10. Жанравая разнастайнасць паэзіі Р. Барадуліна.<br>11. Сучасная паэзія для дзяцей. | 2 | | | Дзіцячая літаратура (беларуская) : вучэб. дапам. / Т. У. Ганчарова-Цынкевіч,<br>С. А. Сычова. – Мінск : БГПУ, 2021. | Асн.<br>:<br>[1],<br>[2],<br>[3].<br><br>Дад.<br>:<br>[4],<br>[6],<br>[7],<br>[8],<br>[12]. | |
| 5.1.1. | 1. Вершы Янкі Купалы на старонках часопіса «Зоркі»: «Песня і казка», «Мароз», «Бай», «Сын і маці».<br>2. Абуджэнне ў дзяцей пачуцця нацыянальнай годнасці, выхаванне любові да роднай зямлі, да роднай мовы – | | 1 | | CD-дыск «Якуб Колас. Янка Купала».<br>Аўдыёматэрыял, | Асн.<br>:<br>[1],<br>[2], | Слуханне вершаў у выкананні<br>М. Міцкевіча<br>Калёквіум па паэзіі |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | верш «Сын і маці».<br>3. Паэтызацыя красы зімовай прыроды ў вершы «Мароз».<br>4. Традыцыі фальклорнай паэтыкі ў творчасці Янкі Купалы.<br>5. Вершы Янкі Купалы 1930-х гг. для юных чытачоў.<br>6. Гісторыя напісання верша «Хлопчык і лётчык». Паэтызацыя духоўнага свету юнага героя.<br>7. Пейзажныя вершы Якуба Коласа для дзяцей. Меладычнасць, высокая культура верша.<br>8. Майстэрства паэта-псіхолага ў сатырычным вершы «Савось-распуснік». | | | | Мн., 2007. Свае творы чытаюць Якуб Колас, Янка Купала; творы Якуба Коласа чытае сын пісьменніка М. Міцкевіч | [3].<br><br>Дад.:<br>[4], [5], [6], [7], [12]. | (чытанне вершаў на памяць) |
